


# АНІКОВІЧ
# ВАСІЛЬ ТРАФІМАВІЧ



Нарадзіўся 5 студзеня 1923 года ў вёсцы Сяльцы (на той перыяд Навасельскі п/с) Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў 7 класаў, працаваў у калгасе. У 1939 годзе працаваў слесарам 30-га будаўнічага трэста горада Масквы. 1 лістапада 1941 года прызываецца ў армію. На фронце – з 20 снежня. Быў стралком, камандзірам стралковага аддзялення, а затым узвода і роты. Ваяваў на Заходнім, 4-м і 3-м Украінскіх і 1-м Беларускім франтах. Скончыў вайсковыя курсы малодшых лейтэнантаў 5-й ударнай арміі. У 1941 годзе вызначыўся ў абароне паўночных ускраін Масквы, у баях на захад ад Валакаламска. У 1942 годзе ўдзельнічаў ва ўсіх трох Ржэўска-Сычэўскіх аперацыях, двойчы ўдзельнічаў у фарсіраванні і баях на рацэ Вазуза. У 1943 годзе ён на пярэдніх рубяжах у ліквідацыі Ржэўска-Вяземскага выступу, у Духаўшчынскай і Смаленскай аперацыях, у вызваленні Смаленска, у баях на Дняпры ў раёне Кахоўкі. У кастрычніку 1943 года ў складзе свайго батальёна ён перакідваецца на 4-ы ўкраінскі фронт, дзе яго залічваюць камандзірам стралковага аддзялення. Дывізіі Аніковіча было прысвоена ганаровае званне “Сталінскай” за ўдзел у вызваленні горада Сталіна (Данецк). Пасля завяршэння курсаў малодшых лейтэнантаў у снежні 1944 года ён прызначаецца камандзірам стралковага ўзвода, удзельнічае ў бітвах на Вісле і Одэры. За гэта будзе прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. У 1944 годзе прымаў удзел у Адэскай і Яска-Кішынёўскай аперацыях, вызваленні Адэсы і Кішынёва, у 1945 годзе – Вісла-Одэрскай аперацыі, фарсіраванні Одэра, Пііліцы, баях на Кюстрынскім плацдарме (заходні бераг Одэра), Берлінскай аперацыі, вулічных баях у Берліне.

Пасля вайны пражываў на малой радзіме. Памёр у 1993 годзе, пахаваны ў в. Курчаўская Усвейка.

**Крыніцы інфармацыі:**

1. **Бирюков, В.** Испытание и войной, и мирной жизнью / Виктор Бирюков // Наша Талачыншчына. – 2012. – 21 ліпеня. – С. 3. – (Время собирать камни).

2. **Аникович Василий Трофимович.** – Память народа : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : pamyat-naroda.ru›heroes/podvig-chelovek_…

3. **Аникович Василий Трофимович – командир взвода** : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : vk.com›wall-177432219_77549.

FREE-OFFICE.NET